742
K12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Установа адукацыі**
**"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"**

УДК 37. 013. 46

**Кавалевіч**
**Марыя Сцяпанаўна**

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ І ТЭХНАЛОГІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАФЕСІЙНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ СТАРШАКЛАСНІКАЎ ВА ЎМОВАХ ПРОФІЛЬНАГА НАВУЧАННЯ

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.01 –
агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Мінск, 2007

242
К12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Установа адукацыі**
**"Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"**

УДК 37. 013. 46

**Кавалевіч**
**Марыя Сцяпанаўна**

# ТЭАРЭТЫЧНЫЯ АСНОВЫ І ТЭХНАЛОГІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАФЕСІЙНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ СТАРШАКЛАСНІКАЎ ВА ЎМОВАХ ПРОФІЛЬНАГА НАВУЧАННЯ

Аўтарэферат дысертацыі
на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук
па спецыяльнасці 13.00.01 –
агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Мінск, 2007

74.200.576.я031
К12

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Работа выканана ў навукова-метадычнай установе адукацыі "Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь"

Навуковы кансультант: **Сцепаненкаў Мікалай Капітонавіч** доктар педагагічных навук, прафесар кафедры педагогікі ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка"

Афіцыйныя апаненты: **Сманцэр Анатоль Пятровіч** доктар педагагічных навук, прафесар кафедры педагогікі і праблем развіцця адукацыі Беларускага дзяржаўнага універсітэта

**Кадол Фёдар Уладзіміравіч** доктар педагагічных навук, загадчык кафедры педагогікі ўстановы адукацыі "Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Францыска Скарыны"

**Міцкевіч Мікалай Іванавіч** доктар педагагічных навук, прафесар, загадчык кафедры матэматычных і прыродазнаўчых дысцыплін установы адукацыі "Расійскі дзяржаўны сацыяльны універсітэт", філіял у г. Мінску

*20504175*

Апаніруючая арганізацыя – установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава"

Абарона адбудзецца 5 чэрвеня 2007 года ў 14.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.21.02 пры ўстанове адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка" па адрасе: 220050, г. Мінск, вул. Савецкая, д. 18, ауд. 482, andaralo.50@mail.ru, тэл. 226-56-23.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка".

Аўтарэферат разасланы 4 мая 2007 года.

Вучоны сакратар
савета па абароне дысертацый А.І. Андарала

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі**. Тэма дысертацыі была ўключана ў зацверджаныя навуковыя планы работы навукова-метадычнай установы “Нацыянальны інстытут адукацыі” Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь у 1997–2000 гг. Дысертацыйнае даследаванне выконвалася ў адпаведнасці з заданнем Дзяржаўнай праграмы фундаментальных даследаванняў “Распрацоўка асноў развіцця сістэмы бесперапыннай адукацыі Рэспублікі Беларусь” (Бесперапынная адукацыя 2001–2005), № дзяржрэгістрацыі 20021101, і планамі НДР установы адукацыі “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна”. Тэма была адобрана рашэннем Савета УА “Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна” і Пастановай № 2 бюро Савета па каардынацыі фундаментальных даследаванняў ад 26 студзеня 2001 г. Тэма даследавання адпавядае аднаму з прыярытэтных кірункаў навуковых даследаванняў, што ажыццяўляюцца ў Рэспубліцы Беларусь, – “Эканоміка і грамадства”.

**Мэта даследавання:** распрацаваць тэарэтычныя асновы, стварыць і эксперыментальна апрабіраваць тэхналогію арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання.

**Задачы даследавання:**

1. Вызначыць тэндэнцыі ў даследаванні працэсу прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў.

2. Даказаць эўрыстычную каштоўнасць і перспектыўнасць міждысцыплінарнага сінергетычнага падыходу ў даследаванні і арганізацыі працэсаў прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў.

3. Распрацаваць канцэпцыю арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання.

4. Раскрыць структуру і змест мадэляў арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання.

5. Выявіць і эксперыментальна апрабіраваць прафарыентацыйныя магчымасці адукацыйнага працэсу ва ўмовах профільнага навучання.

6. Сканструяваць і эксперыментальна праверыць тэхналогію арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання і выявіць яе эфектыўнасць.

7. Распрацаваць дыягностыка-развіццёвы комплекс з мэтай аказання педагагічнай падтрымкі прафесійнага самавызначэння асобы старшакласніка.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. *Асноўныя падыходы і тэндэнцыі* ў вывучэнні працэсу прафесійнага самавызначэння старшых школьнікаў, якія выяўляюцца: у філасофскім кантэксце – на ўзроўні пошуку жыццёвых сэнсаў, праектавання жыццёвага шляху, канструявання жыццёвага поля асобы; у псіхалогіі – у якасці праблемы станаўлення чалавека як суб’екта працоўнай дзейнасці, развіцця прафесійнай самасвядомасці; у педагогіцы – на ўзроўні канструявання тэхналогій арганізацыі прафесійнага самавызначэння. Акцэнт скіраванасці даследаванняў працягвае перамяшчацца ад прафесійнай асветы, прафесійнага ўздзеяння на асобу да яе актывізацыі ў прафесійным сама-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


вызначэнні, выхаванні адказнасці за зроблены выбар перад сабою і перад грамадствам.

2. Выхад з крызісу класічнай тэорыі прафесійнай арыентацыі, пабудаванай у рэчышчы дэтэрмінісцкай парадыгмы і лінейнага мыслення, магчымы на аснове *сінергетычнага падыходу,* які адэкватна адлюстроўвае спосабы вырашэння складанай сацыяльнай праблемы прафесійнага самавызначэння моладзі ў сучасным дынамічным свеце; сінергетыка стварае канструктыўны і эўрыстычны вобраз мыслення і вызначае стратэгію навуковага даследавання, адхіляе адналінейны дэтэрмінізм, дазваляе бачыць працэс прафесійнага самавызначэння адкрытым, самаарганізаваным, з'яўляецца асновай прыняцця абгрунтаванага рашэння ва ўмовах нявызначанасці.

3. *Канцэпцыя арганізацыі* прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, якая грунтуецца на наступных асноўных палажэннях і рэгулятыўных прынцыпах:

• прафесійнае самавызначэнне старшакласніка мэтазгодна разглядаць як сінергетычную сістэму, паколькі яно з'яўляецца няўстойлівым, флуктуацыйным, адкрытым для развіцця і станаўлення асобы. Фактар выпадковасці тут можа адыграць вырашальную ролю. Перадумовамі ўзнікнення і развіцця працэсаў самавызначэння з'яўляюцца: актыўнасць асобы, імкненне яе да самарэалізацыі, наяўнасць хаосу як канструктыўнага механізму самаарганізацыі і выхаду сістэмы на ўласную траекторыю развіцця, а здзейснены прафесійны выбар з'яўляецца інтэграваным вынікам узаемадзеяння хаосу і ўпарадкаванасці; імавернасці і дэтэрмінаванасці; выпадковасці і неабходнасці;

• генезіс прафесійнага самавызначэння забяспечваецца спосабамі ініцыіравання ўласных тэндэнцый развіцця асобы за кошт арганізацыі рэзананснага адукацыйнага асяроддзя, узнікнення механізму самаарганізацыі асобы і пераводу яе шляхам дакладнага і своечасовага ўздзеяння да якасна новага стану развіцця, што вызначаецца атрактарам у пункце біфуркацыі. Імаверны прагноз прафесійнага самавызначэння магчымы, паколькі прафесійны выбар адбываецца дзякуючы спалучэнню імавернага характару развіцця са свядомым адборам знешніх фактараў і спалучэннем іх з уласнай інфармацыйнай праграмай асобы;

• прафесійны выбар абумоўлены канкурэнцыяй і адборам найбольш жыццяздольных шляхоў асобаснага развіцця пад уздзеяннем флуктуацый. У якасці сінергетычнага механізму прафесійнага выбару выступае сукупнасць магчымых шляхоў развіцця дысіпатыўнай сістэмы (тэзаўрус); унутранае ўзаемадзеянне паміж элементамі дысіпатыўнай сістэмы прафесійнага выбару ў выглядзе кааперацыі або канкурэнцыі (дэтэктар); адбор магчымых кірункаў развіцця сістэмы ў мэтах асобаснага росту (селектар); устойлівы стан прафесійнага выбару вызначаецца каштоўнасцямі сістэмы, якія выконваюць ролю атрактараў і прыводзяць у дзеянне механізм самавызначэння асобы;

• працэс прафесійнага самавызначэння асобы як дысіпатыўнай сістэмы – гэта паслядоўнае разгортванне логікі разнастайных фаз стварэння і захавання парадку ў сістэме прафесійнага самавызначэння, забеспячэння ўстойлівасці прафесійнага выбару. Тэхналогія арганізацыі прафесійнага самавызначэння асобы залежыць ад фазнасці руху сістэмы ў працэсе яе станаўлення і развіцця: толькі ў пунктах

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


біфуркацыі прымянімы інфармацыйныя спосабы ўплыву на выбар шляхоў развіцця асобы;

• эфектыўнасць арганізацыі прафесійнага самавызначэння залежыць не столькі ад сілы і велічыні педагагічнага ўздзеяння, колькі ад яго адпаведнасці ўнутраным тэндэнцыям развіцця асобы і своечасовасці прымянення: чым шырэй агульны спектр педагагічнага ўплыву звязаны з унутранымі тэндэнцыямі сістэмы, тым мацнейшы іх сінергетычны эфект. Вырашальную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае ўзаемадапамога, узгодненасць, супрацоўніцтва, сумесныя намаганні педагога і выхаванца ў пабудове і здзяйсненні жыццёвай перспектывы;

• рэгулятыўнай асновай, што вызначае змест, формы, метады і сродкі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, з'яўляецца сістэма сінергетычных прынцыпаў (планаванне дамінантнай перспектывы, поліварыянтнасць шляхоў прафесійнага развіцця, доўгатэрміновае дзеянне, ізамарфізм натуральнага працэсу самаарганізацыі асобы і штучнага працэсу арганізацыі прафесійнага самавызначэння, адкрытасць прафесіяграфічнай і псіхалагічнай інфармацыі).

*Прынцыповая навізна распрацаванай канцэпцыі прафесійнага самавызначэння* заключаецца ў прызнанні канструктыўнай ролі хаосу (сітуацыя нявызначанасці, адсутнасць адзінага рашэння праблемы прафесійнага выбару) як умовы стабільнага і дынамічнага развіцця асобы, магчымасці ініцыіравання працэсу прафесійнага самавызначэння за кошт арганізацыі рэзананснага асяроддзя на аснове дакладных і своечасовых уздзеянняў, вырашэнні пытання пра суадносіны неабходнасці і выпадковасці (выпадковасць разглядаецца не як выключэнне ў працэсе прафесійнага выбару, а як дапушчальна магчымы канструктыўны механізм развіцця і прафесійнага самавызначэння асобы), магчымасці імавернага прагнозу ў выглядзе фармулёўкі стратэгічнай мэты жыцця і вызначэнні параметраў парадку, якія абумоўліваюць кірунак прафесійнага станаўлення асобы.

4. *Дынамічная субстратна-энергаінфармацыйная мадэль* прафесійнага самавызначэння ўключае тры складнікі: субстратную аснову (чалавек як біясацыяльная, культурная і экзістэнцыяльная істота), энергетычнае поле (ідэалы, каштоўнасці, сэнсы, інтарэсы) і інфармацыйнае поле (індывідуальная "карціна свету" прафесій і вобраз самога чалавека ў ім) у дашкольным, малодшым школьным, падлеткавым і юнацкім узросце. Самаарганізацыя ў сістэме прафесійнага выбару прадугледжвае ўзаемасувязь дзвюх узаемадапаўняльных падсістэм: прыроднай (асаблівасці псіхікі, пераважна абумоўленыя генетычнымі фактарамі) і штучнай (прафесійная інфармацыя, псіхолага-педагагічная дыягностыка, педагагічная падтрымка і карэкціроўка выбару, прафесійная кансультацыя, фарміраванне веры ў магчымасць максімальнай самарэалізацыі як сэнсу жыцця). Мадэль пабудавана ў кантэксце сінергетычнай тэорыі функцыянавання і развіцця нераўнаважных сістэм на аснове прынцыпаў адкрытасці, нелінейнасці, няўстойлівасці, самаактуалізацыі, а працэс прафесійнага самавызначэння прадстаўлены як прыродна-штучны, бінарны, ізаморфны.

Антрапалагічная пазіцыйная мадэль узаемадзеяння "аптант – прафкансультант" прадугледжвае, што характар развіцця і самавызначэння асобы адлюстроўваецца ў пазіцыях дарослага як "Родзіча", які задавальняе патрэбы вучняў у бяспецы, прыналежнасці і любові; "Умельца", які нясе адказнасць за задаваль-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


ненне патрэб асобы ў самапавазе і рэалізацыю яе ў соцыуме; "Настаўніка", які адказвае за рэалізацыю асобы аптанта ў культурным асяроддзі; "Мудраца", што задавальняе патрэбы асобы ў самаактуалізацыі і адказвае за рэалізацыю яе ў экзістэнцыяльнай прасторы самавызначэння. Антрапалагічная пазіцыйная мадэль узаемадзеяння "аптант – прафкансультант" пабудавана ўпершыню.

5. *Профільнае навучанне* з'яўляецца прыярытэтным дыдактычным сродкам арганізацыі прафесійнага самавызначэння. Але такім ён становіцца толькі тады, калі прафесійнае самавызначэнне асобы старшакласніка з'яўляецца стратэгічнай мэтай агульнаадукацыйнай школы ўвогуле і кожнага выкладчыка ў прыватнасці. Менавіта мэтаскіраванае выкарыстанне прафарыентацыйных магчымасцяў профільнага навучання і прымяненне нелінейных адукацыйных тэхналогій забяспечвае адэкватнае прафесійнае самавызначэнне асобы старшакласніка сучаснай інавацыйнай установы. Прафарыентацыйныя магчымасці адукацыйных абласцей профільнай школы выяўлены ўпершыню.

6. *Тэхналогія арганізацыі* прафесійнага самавызначэння як дысіпатыўная сістэма, адкрытая разнастайным трансфармацыям, сутнаснымі характарыстыкамі якой з'яўляюцца нелінейнасць, наяўнасць механізму самаарганізацыі і самаразвіцця, раўназначнасць прамой і зваротнай сувязі, партнёрскія ўзаемаадносіны "аптант – прафкансультант", спантаннае ўзрастанне патрабаванняў да суб'ектаў прафесійнага выбару, перспектыўнае ўскоснае ўздзеянне на асобу, залежнасць ад фазнасці руху сістэмы ў працэсе яе станаўлення і развіцця. *У сінергетычнай* фазе тэхналогія прадстаўлена базавай стратэгіяй арганізацыі прафесійнага самавызначэння: арыентацыя аптанта на магчымасць мабільнасці выбараў на прафесійным шляху, нелінейны дыялог, саўдзел у жыццёвых лёсах старшакласнікаў, эўрыстычныя метады, метад "мяккіх сістэм", аўтапаезіс, коўчынгавыя і каўнселінгавыя метады, метад эмпаўрмента, прыёмы ўвядзення новых параметраў парадку, стварэнне камфортных умоў паблізу кропак біфуркацыі для выбару адэкватнага атрактара, эксперыментаванне з прафесійнымі ролямі, папярэджанне крытычных памылак, забеспячэнне выхаду з праблемнай сітуацыі ў кірунку асобаснага і прафесійнага росту.

*Кібернетычная фаза захавання парадку* – гэта ажыццяўленне запланаванага прафесійнага выбару шляхам папярэджання адхіленняў ад пастаўленай мэты, каардынацыя працэсу дасягнення прыватных задач, мінімізацыя варыянтаў выбару, інтэграцыя іх у кірунку агульнай, свабодна пастаўленай мэты з прымяненнем адаптыўных тэхналогій, прыёмаў самаканструявання прафесійна неабходных якасцяў, метадаў псіхалагічных, прафесіяграфічных, сэнсастваральных модуляў, творчага канструявання прафесіяграфічных ведаў, праектных метадаў.

*У адрозненне* ад вядомых тэхналогій лінейнага кіравання працэсам прафесійнай арыентацыі, аўтарская тэхналогія з'яўляецца нелінейнай тэхналогіяй падтрымкі рашэнняў аптанта, упарадкавання працэсаў прафесійнага выбару, пабудавана на сінергетычных прынцыпах і спрыяе эфектыўнай арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў у новых сацыяльна-эканамічных умовах. Асноўным крытэрыем эфектыўнасці тэхналогіі прафесійнага самавызначэння з'яўляецца ўзнікненне механізму самаарганізацыі асобы і пераход яе да якасна новага этапу прафесійнага выбару.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


7. *Дыягностыка-развіццёвы комплекс* уключае блок-схемы "Прафесійны арэол вучэбнага прадмета", дыягнастычныя методыкі для вызначэння ўзроўню прафесійнай самасвядомасці, адаптаваныя тэксты прафесіяграм, аўтарскую праграму спецкурса "Прафесійнае самавызначэнне і самаўдасканаленне асобы" і яе метадычнае забеспячэнне, вучэбна-метадычныя рэкамендацыі для настаўнікаў, класных кіраўнікоў, студэнтаў, навукова-метадычныя матэрыялы для сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі. Упершыню комплекс створаны ў кантэксце сінергетычнай тэорыі самаарганізацыі і самаразвіцця і спрыяе атрыманню высокага сінергетычнага і сацыяльна-эканамічнага эфекту.

*Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць* праведзенага даследавання заключаюцца ў тым, што ў ім упершыню ў кантэксце сінергетычнай тэорыі развіцця распрацаваны і эксперыментальна праверaны канцэпцыя, мадэлі і нелінейная тэхналогія арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання, якія спрыяюць паспяховаму самавызначэнню і самарэалізацыі. Распрацаваныя мадэлі і тэхналогія, у адрозненне ад вядомых мадэляў і тэхналогій лінейнага кіравання працэсам прафесійнай арыентацыі, з'яўляюцца нелінейнымі мадэлямі і тэхналогіяй падтрымкі рашэнняў аптанта, дапускаюць творчасць педагога і вучня і пабудаваны на сінергетычных законах і прынцыпах. У іх аснове біфуркацыйны механізм працэсу прафесійнага выбару, у якасці якога выступае спалучэнне тэзаўруса, дэтэктара, і селектара.

*Заканамернасці,* якія выяўлены на аснове аналізу тэарэтычных і эмпірычных даных, заключаюцца: у спалучэнні арганізацыі і самаарганізацыі, выпадковасці і неабходнасці, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, хаосу і парадку як канструктыўных механізмаў працэсу прафесійнага выбару; магчымасці забеспячэння генезісу прафесійнага самавызначэння спосабамі ініцыіравання ўласных тэндэнцый развіцця сістэмы за кошт арганізацыі рэзананснага адукацыйнага асяроддзя, узнікнення механізму самаарганізацыі асобы і пераводу яе на аснове дакладнага і своечасовага ўзаемадзеяння да якасна новага стану развіцця, кірунак якога вызначаецца атрактарам у пункце біфуркацыі; залежнасці тэхналогіі арганізацыі прафесійнага самавызначэння ад фазнасці руху асобы ў працэсе яе станаўлення і развіцця.

**Асабісты ўклад суіскальніка.**

Праведзенае даследаванне – вынік шматгадовай працы суіскальніка. Аўтару належыць ідэя вызначэння тэарэтычных асноў арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання. Прапанаваныя ў дысертацыі канцэпцыя, мадэлі і тэхналогія арганізацыі працэсу прафесійнага самавызначэння распрацаваны на аснове ўласнага тэарэтычнага і эксперыментальнага пошукаў, што знайшло адлюстраванне ў апублікаваных аўтарам манаграфіі, падручніку, вучэбных дапаможніках, артыкулах і іншых навуковых і дыдактычных матэрыялах, скіраваных на аказанне дапамогі педагагічным работнікам у арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў і павышэнне ўзроўню іх прафесійнай самасвядомасці. Даследаванне праведзена аўтарам індывідуальна, усе без выключэння публікацыі выкананы і падрыхтаваны да друку самастойна і без сааўтарства.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


Першы ўзровень даследавання (1971–1973 гг.) меў прыкладны кірунак. Аналіз прафарыентацыйных магчымасцяў вучэбных прадметаў насіў лакальны характар і садзейнічаў мадэляванню асобных кампанентаў адукацыйнага працэсу ў вясковай школе.

На другім узроўні вывучаўся вопыт работы сельскай школы па прафесійнай арыентацыі падлеткаў. Была сфармулявана гіпотэза аб неабходнасці стварэння сістэмы прафарыентацыйнай работы ў сельскай школе і вызначаны псіхолага-педагагічныя ўмовы функцыянавання гэтай сістэмы. Вынікам з'явілася кандыдацкая дысертацыя "Дыдактычныя асновы арыентацыі вучняў на сельскагаспадарчыя прафесіі (у працэсе навучання батаніцы і працы па раслінаводству)" (1978 г.). Навуковыя ідэі кандыдацкай дысертацыі ўкараняліся праз распрацоўку зместу прафарыентацыйнай работы, абсталяванне кабінетаў прафесійнай арыентацыі ў сельскіх школах Брэсцкай вобласці і арганізацыю работы ў іх (1979–1989 гг.). Ажыццяўлялася далейшае вывучэнне прафарыентацыйных магчымасцяў школьнага курса біялогіі. Вынікам з'явіўся вучэбны дапаможнік для настаўнікаў "Арыентацыя вучняў на сельскагаспадарчыя прафесіі пры вывучэнні біялогіі" (1993 г.).

Са з'яўленнем у рэспубліцы інавацыйных тыпаў навучальных устаноў (ліцэяў і гімназій) пачаўся наступны этап тэарэтычнага і эксперыментальнага даследавання, скіраванага на распрацоўку канцэптуальных падыходаў, мадэляў і тэхналогіі арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання (1997–2006 гг.).

Педагагічны эксперымент ажыццяўляўся асабіста аўтарам у ліцэі № 1, гімназіі № 2 г. Брэста, у Іванаўскай гімназіі Брэсцкай вобласці, у Чэрвеньскай гімназіі Мінскай вобласці, у Магілёўскім абласным ліцэі, у Магілёўскай гімназіі № 1, у Брэсцкім дзяржаўным інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А.С. Пушкіна. Паўторны эксперымент праведзены настаўніцай біялогіі ліцэя № 1 Тамарай Якаўлеўнай Мароз у класах біёлага-хімічнага профілю, Аленай Сцяпанаўнай Каліноўскай і Нінай Фёдараўнай Зяленка сумесна з аспіранткай Аленай Пятроўнай Шаўчук у класах лінгвістычнага профілю гэтага ж ліцэя. Усімі відамі эксперыменту было ахоплена 430 вучняў, 120 настаўнікаў, 115студэнтаў.

**Апрабацыя вынікаў даследавання.** Асноўныя вынікі даследавання дакладваліся на міжнародным кангрэсе "Университетское образование: опыт тысячелетия, проблемы, перспективы развития" (Мінск, 2003), 50 міжнародных канферэнцыях, што праводзіліся ў Беларусі, Расіі, Украіне, Балгарыі, Польшчы: "ТехноОБРАЗ–99: Технологии непрерывного образования и творческого саморазвития личности" (Гродна, 1999); "Современные проблемы гуманистической педагогики (методологические, научно-теоретические, технологические): опыт и перспективы развития" (Разань, 1999); "Современные тенденции трудового обучения и воспитания молодёжи" (Віцебск, 1999); "Адаптация к профессиональной деятельности как психолого-педагогическая проблема: методологические основания, пути и способы решения" (Баранавічы, 2001); "ТехноОБРАЗ–2001: Технологии непрерывного образования и саморазвития личности" (Гродна, 2001); "Теоретические и прикладные проблемы психологии педагогического межличностного взаимодействия" (Мінск, 2002); "Адаптация к профессиональной деятельности как пси-

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

хологическая проблема: методологические основания, пути и способы решения" (Баранавічы, 2003), "Медико-психологическая и социально-педагогическая поддержка саморазвития и самоопределения личности" (Брэст, 2003), "Превантивна педагогика като научно познание" (Сафія, 2003), "Сравнительная педагогика в условиях международного сотрудничества" (Брэст, 2003), "Sport powszechny w integracji z niepełnosprawnymi we wspólnej Europie" (Бяла Падляска, 2003), "Интеграция педагогической науки и практики как доминирующий фактор развития образования XXI века: методология, теория и практика" (Мінск, 2003), "Roswój obszarów przygranicznych w kontekście funkcjonowania euroregionów" (Бяла Падляска, 2004), "Absorpcja budżetowych środków finansowych wspierających roswój obszarów wiejskich" (Седльцэ, 2004), "Ekonomiczne i społeczne skutki integracji Polski z Unią Europejską dla rolnictwa i obszarów wiejskich" (Седльцэ, 2005) і інш.; на пасяджэннях кафедры педагогікі агульнай і педагогікі дзяцінства Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А.С. Пушкіна; на пасяджэннях вучонага савета Нацыянальнага інстытута адукацыі; на аўтарскіх курсах дырэктараў школ, педагагаў-арганізатараў, настаўнікаў-прадметнікаў, арганізаваных у Брэсцкім дзяржаўным інстытуце павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі; у Рэспубліканскім цэнтры прафесійнай арыентацыі моладзі.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.**

Асноўныя палажэнні і матэрыялы дысертацыі знайшлі адлюстраванне ў 102 работах аўтара: манаграфіі (12,6 аўт. л.), 39 артыкулах у навуковых часопісах (у тым ліку 31 артыкул у рэцэнзаваных навуковых часопісах, што складае 15,3 аўт. л.) і 8 артыкулах у навуковых часопісах (3 аўт. л ), 9 артыкулах у навуковых зборніках (3,75 аўт. л.), 44 – у зборніках матэрыялаў і тэзісаў канферэнцый, у тым ліку ў Расіі, Украіне, Польшчы, Балгарыі (11,3 аўт. л.), падручніку па педагогіцы з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (12,8 аўт. л.), 8 вучэбных і метадычных дапаможніках (30 аўт. л.). Агульная колькасць матэрыялаў складае 1 513 старонак (88,75 аўт. л.).

**Структура і аб'ём дысертацыі.**

Дысертацыя ўтрымлівае пералік умоўных абазначэнняў, уводзіны, агульную характарыстыку работы, 4 главы, заключэнне, бібліяграфічны спіс, дадатак. Логіка дысертацыйнага даследавання пабудавана ў адпаведнасці з пастаўленымі задачамі. Вызначаны тэндэнцыі ў вывучэнні і арганізацыі працэсу прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, даказана мэтазгоднасць сінергетычнага падыходу ў даследаванні і арганізацыі працэсаў прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў. Сфармуляваны і абгрунтаваны асноўныя канцэптуальныя палажэнні, пабудаваны сінергетычная і антрапалагічная мадэлі арганізацыі прафесійнага самавызначэння, выяўлены прафарыентацыйныя магчымасці профільнай адукацыі, сканструявана нелінейная тэхналогія арганізацыі прафесійнага самавызначэння і эксперыментальна даказана яе эфектыўнасць.

Агульны аб'ём дысертацыі складае 368 старонак, у тым ліку 33 старонкі займае бібліяграфічны спіс (503 пазіцыі). Дысертацыя ўключае 14 малюнкаў (7 старонак), 50 табліц (16 старонак). Дадаткі размешчаны на 119 старонках.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


Вынікі даследавання ўзбагацілі тэорыю і метадалогію прафесійнага самавызначэння, заклалі новыя падыходы для даследаванняў у гэтай вобласці. Сярод іх: спалучэнне ідэі самаарганізацыі з ідэяй самапазнання і самавызначэння як новага дыялогу чалавека з прыродай, грамадствам і самім сабою; прымяненне міждысцыплінарнага падыходу ў мадэляванні і тэхналагізацыі працэсаў асобаснага і прафесійнага развіцця; дыдактычныя праблемы адаптацыі ідэй сінергетыкі і антрапалогіі да зместу профільнай адукацыі, іх выкарыстанне ў якасці метадалагічнай асновы педагагічных даследаванняў; тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўка сінергетычных і антрапалагічных мадэляў і тэхналогій арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў.

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Работа прызначана для навуковых супрацоўнікаў, кіраўнікоў і выкладчыкаў ліцэяў і гімназій, якія займаюцца праблемамі профільнай падрыхтоўкі старшакласнікаў, а таксама для работнікаў Міністэрства адукацыі, Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва. Прапанаваныя новыя канцэптуальныя падыходы да арганізацыі прафесійнага самавызначэння могуць быць выкарыстаны пры распрацоўцы адукацыйнага стандарта, вучэбных праграм па агульнаадукацыйных і профільных прадметах, арганізацыі сацыяльнай абароны насельніцтва. Прапанаваныя ў даследаванні мадэлі арганізацыі прафесійнага самавызначэння могуць быць выкарыстаны як канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі падтрымкі аптанта ў сітуацыі выбару траекторыі свайго жыццёвага прафесійнага шляху. Асноўныя рэгулятыўныя прынцыпы, на якіх пабудаваны гэтыя мадэлі, могуць быць карыснымі для павышэння якасці арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання.

Эксперыментальная тэхналогія арганізацыі прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў, скіраваная на развіццё асобы, фарміраванне веры ў сэнс жыцця, максімальныя магчымасці самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці, можа быць выкарыстана ў практыцы агульнаадукацыйнай школы для аказання педагагічнай падтрымкі аптантаў. Дыдактычныя распрацоўкі і матэрыялы могуць знайсці прымяненне пры выкладанні ў ліцэі або гімназіі факультатыўнага курса “Прафесійнае самавызначэнне і самаўдасканаленне асобы” і вучэбнага курса “Псіхалагічныя асновы прафесійнай арыентацыі ” ва універсітэце.

Вучэбна-метадычны комплекс з’яўляецца камерцыйным прадуктам для арганізацый і асоб, якія займаюцца распрацоўкай і ўкараненнем новых тэхналогій дыягностыкі і арганізацыі прафесійнага самавызначэння, і мае пэўны сацыяльна-эканамічны эфект. Акты аб укараненні вучэбна-метадычнага комплексу ў адукацыйны працэс універсітэтаў, інстытутаў павышэння кваліфікацыі, ліцэяў і гімназій рэспублікі прадстаўлены ў дадатку дысертацыі.

Актуальнымі з’яўляюцца праблемы адкрыцця ў педагагічных і класічных універсітэтах новых спецыяльнасцяў па падрыхтоўцы антраполагаў-прафкансультантаў, уключэння ва ўсе вучэбныя планы педагагічных спецыяльнасцяў вучэбных і спецыяльных курсаў па псіхалогіі і педагогіцы прафесійнага самавызначэння.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ СУІСКАЛЬНІКА

### Манаграфія


1 Кавалевіч, М.С. Прафесійнае самавызначэнне старшакласнікаў інавацыйнай школы: метадалогія, тэорыя, тэхналогія: манаграфія / М.С. Кавалевіч; пад рэд. М.К. Сцепаненкава. – Брэст: БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2003. – 267 с.


### Артыкулы ў навуковых рэцэнзаваных часопісах


2 Кавалевіч, М.С. Аб узроўні падрыхтаванасці сучаснага педагога да вырашэння праблем прафесійнага самавызначэння школьніка / М.С. Кавалевіч // Вышэйшая школа. – 1999. – № 3/4. – С. 65–66.

3 Кавалевіч, М.С. Выбар прафесіі, арыенціры і спосабы самавызначэння / М.С. Кавалевіч // Адукацыя і выхаванне. – 1999. – № 11. – С. 27–30.

4 Кавалевіч, М.С. Канцэптуальныя асновы новай мадэлі прафесіянальнага самавызначэння аптантаў / М.С. Кавалевіч // Народная асвета. – 1999. – № 8. – С. 147–153.

5 Кавалевіч, М.С. Прафесійнае самавызначэнне аптанта інавацыйнай школы / М.С. Кавалевіч // Тэхналагічная адукацыя. – 1999. – № 3. – С. 83–96.

6 Кавалевіч, М.С. Інавацыі ў педагогіцы: выбар прафесіі / М.С. Кавалевіч // Адукацыя і выхаванне. – 2000. – № 12. – С. 65–68.

7 Кавалевіч, М.С. Праблема асобаснага і прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў: каштоўнасна-сэнсавы аспект / М.С. Кавалевіч // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2000. – № 1. – С. 66–76.

8 Кавалевіч, М.С. Праблема будучыні ў прафесіянальным самавызначэнні старшакласнікаў / М.С. Кавалевіч // Народная асвета. – 2000. – № 11. – С. 6–11.

9 Кавалевіч, М.С. Прафесійнае самавызначэнне асобы (рэсурсна-інфармацыйная мадэль) / М.С. Кавалевіч // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2000. – № 5. – С. 89–99.

10 Кавалевіч, М.С. Самавызначэнне асобы з пазіцый мадэлявання / М.С. Кавалевіч // Тэхналагічная адукацыя. – 2001. – № 3. – С. 52–58.

11 Кавалевіч, М.С. Сэнсажыццёвыя арыентацыі і каштоўнасці старшакласнікаў / М.С. Кавалевіч // Адукацыя і выхаванне. – 2001. – № 12. – С. 50–54.

12 Кавалевіч, М.С. Прафесіянальнае самавызначэнне асобы: сінергетычны аспект // Народная асвета. – 2001. – № 3. – С. 3–9.

13 Ковалевич, М.С. Методология процесса профессионального самоопределения: синергетический аспект / М.С. Ковалевич // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2002. – № 3. – С. 93–98.

14 Ковалевич, М.С. Методология процесса профессионального самоопределения: синергетический аспект. Профессиональное самоопределение оптанта как синергетическая система / М.С. Ковалевич // Веснік Брэсцк. ун-та. Серыя гуманітар. і грамад. навук. – 2002. – № 5. – С. 78–85.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


15 Кавалевіч, М.С. Педагагічная падтрымка аптантаў у працэсе прафесійнальнага самавызначэння / М.С. Кавалевіч // Народная асвета. – 2002. – № 11/12. – С. 23–26.

16 Кавалевіч, М.С. Прафесійнае самавызначэнне навучэнскай моладзі: пастаноўка праблемы / М.С. Кавалевіч // Тэхналагічная адукацыя. – 2002. – № 2. – С. 87–95.

17 Кавалевіч, М.С. Прэзентацыя праектаў як сродак актывізацыі прафесійнага самавызначэння / М.С. Кавалевіч // Біялогія. Праблемы выкладання. – 2002. – № 2. – С. 109–121.

18 Ковалевич, М.С. Методологические основания модернизации профессионального образования: синергетический аспект / М.С. Ковалевич // Известия Межд. акад. наук высшей школы. – 2003. – № 3. – С. 155–165.

19 Кавалевіч, М.С. Тэхналогія рэалізацыі прафарыентацыйных магчымасцяў вучэбнага працэсу ў інавацыйнай школе: біялогія / М.С. Кавалевіч // Біялогія. Праблемы выкладання. – 2003. – № 1. – С. 65–77.

20 Кавалевіч, М.С. Метадалагічныя асновы вырашэння праблемы прафесійнага самавызначэння: канструктыўна-філасофскі сінтэз / М.С. Кавалевіч // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманіт. і грамад. навук. Спецвыпуск. – 2004. – С. 7–19.

21 Кавалевіч, М.С. Асобаснае і прафесійнае самавызначэнне: антрапалагічны падыход / М.С. Кавалевіч // Весці Беларус. дзярж. педагаг. ун-та. Сер. 1. Педагогіка. – 2004. – № 3. – С. 7–13.

22 Кавалевіч, М.С. Біялогія і яе прафарыентацыйныя магчымасці ва ўмовах профільнага навучання / М.С. Кавалевіч // Біялогія. Праблемы выкладання. – 2004. – № 3. – С. 3–11.

23 Кавалевіч, М.С. Модульнае навучанне як сродак актывізацыі прафесійнага самавызначэння ва ўмовах профільнага навучання / М.С. Кавалевіч // Народная асвета. – 2004. – № 2. – С. 6–10.

24 Кавалевіч, М.С. Прафесійнае самавызначэнне старшакласнікаў ва ўмовах профільнага навучання: метадалагічныя асновы, спосабы вырашэння / М.С. Кавалевіч // Адукацыя і выхаванне. – 2004. – № 12. – С. 3–10.

25 Кавалевіч, М.С. Прафесійнае самавызначэнне старшакласнікаў ва ўмовах профільнай адукацыі / М.С. Кавалевіч // Народная асвета. – 2004. – № 7. – С. 32–37.

26 Кавалевіч, М.С. Тэорыя і практыка прафесійнага самавызначэння асобы: параўнальны аспект / М.С. Кавалевіч // Науковій Віснік Волінськ. ун-ту ім. Лесі Украінкі. – 2004. – № 6. – С. 297–303.

27 Кавалевіч, М.С. Асобаснае і прафесійнае самавызначэнне: псіхолага-педагагічная інтэрпрэтацыя быццёвых і культурных пазіцый педагога-прафкансультанта. Артыкул 1 / М.С. Кавалевіч // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2005. – № 1. – С. 60–71.

28 Кавалевіч, М.С. Асобаснае і прафесійнае самавызначэнне: псіхолага-педагагічная інтэрпрэтацыя быццёвых і культурных пазіцый педагога прафкансультанта. Артыкул 2 / М.С. Кавалевіч // Веснік Брэсцк. ун-та. Сер. гуманітар. і грамад. навук. – 2005. – № 2. – С. 93–100.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ


29 Ковалевич, М.С. Реализация проекта "Человек". Личностное и профессиональное самоопределение: антропологический подход / М.С. Ковалевич // Народная асвета. – 2005. – № 11. – С. 3–6.

30 Кавалевіч, М.С. Станаўленне сінергетычнага падыходу да даследавання працэсаў самавызначэння / М.С. Кавалевіч // Весці Беларус. дзярж. педаг. ун-та. Сер. 2. Філасофія. – 2006. – № 3. – С. 47–50.

